# ГІСТОРЫЯ ВЫВУЧЭННЯ СУБКУЛЬТУРЫ ДЗЯЦІНСТВА ПАЎНОЧНАЙ БЕЛАРУСІ

**У. Я. АЎСЕЙЧЫК**

У артыкуле разгледжана гістарыяграфія па пытаннях субкультуры дзяцінства Паўночнай Беларусі ў айчыннай гуманітарыстыцы. Вылучаны асноўныя перыяды ў вывучэнні праблематыкі, раскрыта значэнне даследаванняў і іх уклад у вывучэнне субкультуры дзяцінства. У артыкуле прааналізаваны працы, якія былі апублікаваны з сярэдзіны XIX ст. і да нашага часу.

Ключавыя словы: гістарыяграфія, субкультура дзяцінства, паўночная Беларусь, беларускі этнас.

**УДК 392.1(476)**

У беларускай навуцы доўгі час пытанні, звязаныя з субкультурай дзяцінства не з’яўляліся аб’ектам самастойных даследаванняў. Толькі ў канцы XX – пачатку XXI ст. з’явіўся шэраг навуковых работ, прысвечаных дадзенай праблематыцы. Пры гэтым трэба адзначыць, што пачынаючы з сярэдзіны XIX ст. у этнаграфічных і фалькларыстычных зборніках быў апублікаваны вялікі аб’ём матэрыялаў па дадзенай тэме. У іх знаходзім матэрыялы па народнай педагогіцы, сродках і метадах выхавання, дзіцячаму фальклору, гульнях і забавах, народнай медыцыне, функцыях і ролі дзяцей у абрадах і г. д.

*Працы сярэдзіны XIX – пачатку XX ст.* Першыя працы, дзе быў змешчаны некаторы матэрыял па дадзенай праблематыцы, былі апублікаваны яшчэ ў першай палове XIX ст. Да іх ліку адносяцца зборнікі А. Рыпінскага і Я. Чачота, працы П. М. Шпілеўскага і А. Г. Кіркора, якія ўтрымліваюць тэксты калыханак і дзіцячых песень, а таксама апісанні гульняў і забаў.

Вялікі аб’ём беларускага песеннага матэрыялу быў апублікаваны знакамітым паэтам і фалькларыстам першай паловы XIX ст. Я. Чачотам. Ён запісаў каля 1000 песень, якія ў 1837–1846 гг. былі апублікаваны ў шасці яго зборніках. У трэцім зборніку «Piosnki wieśniacze z nad Dźwiny» [1], выдадзеным у 1840 г., асобна вылучаны дзіцячыя песні. Разам з тым даследчык зрабіў некалькі заўваг аб цяжкім становішчы дзяцей у беларускім сялянскім грамадстве [1, s. 25]. У сваім апошнім шостым зборніку «Piosnki wieśniacze znad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiotyzmy w mowie sławiano-krewickiej, z postrzeżeniami nad nią uczonymi» (1846) [2] аўтар таксама змясціў дзіцячыя песні.

Яшчэ адным даследчыкам першай паловы XIX ст., які апублікаваў значны аб’ём тэкстаў вуснапаэтычнай творчасці беларусаў, быў А. Ф. Рыпінскі. У час навучання ў Віцебскай гімназіі ён займаўся збіраннем фальклору беларускага насельніцтва. Пасля паўстання 1830–1831 гг. даследчык быў вымушаны эміграваць у Францыю. У 1840 г. у Парыжы ён выдае працу «Беларусь! Колькі слоў пра паэзію простага люду той нашай польскай правінцыі, пра яго музыку, песні, танцы і інш.» [3]. Аўтар прысвяціў яе дзіцячаму фальклору. Так, у асобным раздзеле «Спевы нянек» ахарактарызаваў гэтую групу фальклорных тэкстаў, а таксама прывёў самі тэксты [3, s. 150–163]. А ў раздзеле «Гульні і забавы» апісаў моладзевую гульню «Падушачка» і традыцыю ваджэння казы на Каляды [3, s. 176–184].

У сярэдзіне XIX ст. была апублікавана праца П. М. Шпілеўскага «Беларусь у характарыстычных апісаннях і фантастычных яе сказах», якая ўтрымлівае матэрыялы па дадзенай праблематыцы. Даследаванне было выдадзена ў 1853–1856 гг. у часопісе «Пантэон». У ёй былі разгледжаны гульні і забавы беларусаў. Гэтым тэмам былі прысвечаны два раздзелы ў публікацыі «Калядныя павячоркі» і «Ігрышчы» [4].

У 1858 г. у «Этнаграфічным зборніку» была апублікавана праца А. Г. Кіркора «Этнаграфічны погляд на Віленскую губерню». У ёй ахарактарызаваны некаторыя аспекты выхавання дзяцей, апісаны моладзевыя забавы і гульні («Жаніцьба Цярэшкі», «Падушачка» і інш.) мясцовага насельніцтва [5].

Найбольш плённым перыядам у вывучэнні фальклорнай і этнаграфічнай спадчыны паўночнага рэгіёна Беларусі, у тым ліку і субкультуры дзяцінства, была другая палова XIX – пачатак XX ст. Якраз у гэты перыяд быў апублікаваны значны аб'ём этнаграфічных і фальклорных матэрыялаў па гэтай тэме. Так, багаты этнаграфічны матэрыял аб субкультуры дзяцей утрымліваецца ў працы Ю. Ф. Крачкоўскага «Нарысы быту заходнерускага селяніна» [6]. Аўтар звярнуў увагу на асаблівасці выхавання дзяцей, іх удзел у гаспадарчых работах, абрадах сямейнага і каляндарнага цыклаў. Таксама апісаў іх адзенне, гульні і забавы.

Значнае месца «дзіцячая» праблематыка знайшла ў працах этнографаў М. Я. Нікіфароўскага, П. В. Шэйна, Е. Р. Раманава.

У зборніках П. В. Шэйна апублікаваны значны аб'ём узораў дзіцячага фальклору. Яго выданні змяшчаюць калыханкі, дзіцячыя песні, апісанні гульняў і малыя дзіцячыя фальклорныя жанры. Таксама ў выданнях змешчаны каштоўныя апісанні побыту дзяцей, асаблівасці іх выхавання. Так, у працы «Беларускія народныя песні» (1874) асобны раздзел прысвечаны дзіцячаму фальклору, а таксама апісаны моладзевыя гульні, звязаныя з каляндарнай абраднасцю беларусаў [7, с. 16–38]. У першым томе «Матэрыялы для вывучэння быту і мовы рускага насельніцтва Паўночна-Заходняга краю» (1887) таксама змешчаны раздзел з тэкстамі дзіцячага фальклору [8, с. 29–36]. У ім змешчаны не апублікаваныя раней тэксты, у тым ліку і з паўночнай Беларусі. У трэцім томе выдання два раздзелы прысвечаны «дзіцячай» тэматыцы. Так, адзін з іх «Выхаванне дзяцей» [9, с. 76–80] утрымлівае інфармацыю не толькі па розных аспектах выхавання і сацыялізацыі дзяцей, але і лячэнні, адзенні, іх удзеле ў гаспадарчых занятках і г. д. А ў раздзеле «Гульні дзяцей і дарослых» [9, с. 191–224] змешчаны апісанні дзіцячых гульняў, шэраг якіх запісаны ў паўночнай Беларусі.

Этнограф М. Я. Нікіфароўскі ў сваёй працы «Прастанародныя прыкметы і павер'і... Віцебскай Беларусі» (1897) [10] дадзенай праблематыцы прысвяціў першы раздзел «Дзіця ад пачатку да канца блазноцтва». У ім змешчаны разнастайныя прыкметы і павер'і, звязаныя з дзецьмі. Другі раздзел працы быў прысвечаны моладзі. У астатніх раздзелах таксама сустракаюцца матэрыялы, якія датычацца дзяцей і падлеткаў. Дадзены зборнік з'яўляецца адным з багацейшых збораў разнастайных прыкмет і павер'яў з паўночнай Беларусі, якія датычацца дзяцей. Да праблематыкі дзіцячых гульняў М. Я. Нікіфароўскі звярнуўся ў асобнай працы «Нарысы Віцебскай беларусі: гульні і ігракі» (1897). У ёй апісаны найбольш распаўсюджаныя гульні ў рэгіёне. Дзіцячыя гульні прадстаўлены ў раздзеле «Дзіцячыя бавы» [11, с. 22–32], а гульні падлеткаў у раздзеле «Бавы падлеткаў»

[11, с. 32–39]. У працы таксама змешчана інфармацыя па асаблівасцях выхавання дзяцей.

У працах Е. Р. Раманава знаходзім вялікі аб'ём апісанняў дзіцячых песень, гульняў і забаў, зафіксаваных на тэрыторыі Магілёўскай губерні. Гэтыя матэрыялы былі апублікаваны ў першым і восьмым тамах яго выдання «Беларускі зборнік». У першым томе зборніка былі апублікаваны тэксты дзіцячых песень [12, с. 169–179]. Вялікі аб'ём апісанняў дзіцячых гульняў, а таксама цацак, з якімі гулялі дзеці, быў змешчаны ў восьмым томе зборніка [13, с. 553–593].

Цікавы матэрыял утрымліваецца таксама ў працы этнографа А. Я. Багдановіча «Перажыткі старажытнага светасузірання ў Беларуса» (1895) [14]. У ёй прыведзена апісанне дзіцячых гульняў, змешчаны шэраг прыкмет і павер'яў, звязаных з дзецьмі.

*Працы 1920–1930-х гг.* Новы этап у вывучэнні народнай культуры насельніцтва паўночнай Беларусі прыходзіцца на міжваенны перыяд. Паколькі тэрыторыя Беларусі ў гэты перыяд была падзелена на часткі і знаходзілася ў складзе розных дзяржаў – Польшчы і БССР, то даследаванне краю адбывалася як з боку савецкай навукі, так і з боку заходнебеларускіх і польскіх вучоных. У гэты перыяд таксама ажыццяўлялася фальклорна-этнаграфічнае даследаванне беларускага насельніцтва на тэрыторыі Латгаліі (С. П. Сахараў).

У 1920–1930-я гг. асобных даследаванняў, прысвечаных «дзіцячай» тэме, было апублікавана вельмі мала. У беларускім савецкім нарадазнаўстве міжваеннага перыяду бадай адзіным праграмным даследаваннем з'яўляецца артыкул М. Касяровіча «Для чаго і як вывучаць быт дзяцей» [15], які быў надрукаваны ў часопісе «Наш край» у 1930 г. У ім аўтар аналізуе актуальнасць вывучэння феномену дзяцінства, вызначае канкрэтныя яго накірункі. Даследчык звярнуў увагу на неабходнасць сістэмнага даследавання побыту дзяцей з боку этнаграфічнай навукі. У гэты перыяд вывучэннем дзіцячых гульняў займаўся А. Грыневіч. Ён падрыхтаваў зборнік «Народныя гульні, запісаныя ў камуне «Красный маяк» на месцы былога Сар'янскага двара Дрысенскага пав. Полацкай акругі ў чэрвені 1928 г.» [16, с. 11]. А ў 1928 г. у шэрагу нумароў «Беларускай крыніцы» (№ 39–53) была апублікавана вялікая праца У. Казлоўшчыка «Аб фізічным выхаванні ў беларусаў» [17]. У ёй прасочана гісторыя фізічнага выхавання моладзі з эпохі Сярэднявечча, а таксама апісаны традыцыйныя гульні беларусаў, структураваныя па асобных групах. Праца з'яўляецца адным з багацейшых збораў матэрыялаў па гульнях беларускіх дзяцей на той час.

Як вынікае з аналізу апублікаваных у той перыяд даследаванняў, гэтая праблематыка па-ранейшаму разглядалася і ў абагульняючых даследаваннях, прысвечаных побыту і народнай культуры мясцовага насельніцтва. Але і такіх публікацый у 1920–1930-х гг. было апублікавана даволі мала. Сярод іх асаблівай увагі вартыя зборнікі А. А. Шлюбскага і С. П. Сахарава. У сваім зборніку «Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны» (1928, ч. II) А. А. Шлюбскі не абыйшоў увагай дзіцячы фальклор [18]. Значны аб'ём матэрыялаў па дадзенай праблематыцы быў зафіксаваны этнографам С. П. Сахаравым ад беларусаў Латгаліі. Частка гэтых запісаў была апублікавана ў зборніку «Народная творчасць Латгальскіх і Ілукстэнскіх беларусаў» (1940). Выданне змяшчае тэксты дзіцячага фальклору з кароткай характарыстыкай іх

жанраў. Гэтыя матэрыялы змешчаны ў трох невялікіх раздзелах «Калыханкі» [19, с. 71–72], «Забаўлянкі» [19, с. 73–75], «Дзіцячыя песні» [19, с. 75–77].

*Даследаванні другой паловы XX – пачатку XXI ст.* У беларускай гуманітарыстыцы вывучэнне субкультуры дзяцінства ў другой палове XX – пачатку XXI ст. адбывалася ў двух напрамках. Першы звязаны з вывучэннем народнай педагогікі, а другі – з дзіцячым фальклорам і гульнямі.

У беларускім нарадазнаўстве ў пасляваенны перыяд адной з папулярных тэм даследаванняў былі дзіцячыя гульні. Пачынаючы з канцы 1940-х гг. былі апублікаваны некаторыя працы па гэтай тэме. У 1948 г. была выдадзена кніга В. Каспяровіча «Сто гульняў» [20], матэрыялы да якой былі падрыхтаваны яшчэ ў даваенны перыяд. У 1950–1970-я гг. вывучэннем дзіцячых гульняў займаўся Я. Р. Вількін. У 1969 г. быў выдадзены зборнік «Беларускія народныя гульні» [21]. А праз некаторы час даследчык абараніў кандыдацкую дысертацыю па гэтай праблематыцы «Беларускія народныя гульні другой паловы XIX – пачатку XX ст.» [22].

Своеасаблівым падсумаваннем даследаванняў па беларускіх народных гульнях стала выданне ў 1996 г. у серыі БНТ зборніка «Гульні, забавы, ігрышчы» [16], які падрыхтаваў А. Ю. Лозка. У ім змешчаны апісанні разнастайных гульняў і забаў. Зборнік таксама суправаджаецца ўступным артыкулам (аўтарам з'яўляецца А. Ю. Лозка), у якім характарызуецца гісторыя вывучэння дадзенага феномена, даецца класіфікацыя гульняў, разглядаецца іх рэгіянальная спецыфіка.

У пасляваенны перыяд пашыранымі сталі і фалькларыстычныя даследаванні дзіцячага фальклору. Так, яшчэ ў 1972 г. у серыі БНТ быў апублікаваны зборнік «Дзіцячы фальклор» [23]. Яго падрыхтавала Г. А. Барташэвіч. Зборнік змяшчае вялікі аб'ём узораў дзіцячага фальклору беларусаў. Праца таксама суправаджаецца ўступным артыкулам, падрыхтаваным Г. А. Барташэвіч. У ім коратка разглядаецца гісторыя даследавання дзіцячага фальклору, даецца характарыстыка яго тэарэтычным аспектам. Аўтарству Г. А. Барташэвіч належыць яшчэ некалькі абагульняючых даследаванняў, прысвечаных беларускаму дзіцячаму фальклору [24; 25].

Даследаванні народнай педагогікі беларусаў асаблівую папулярнасць атрымалі ў 1990–2000-я гг. Ужо на пачатку 1990-х гг. было апублікавана некалькі абагульняючых калектыўных выданняў. Так, у 1995 г. была выдадзена кніга «Нарысы педагагічнай думкі беларускага народа» [26], а ў 1996 г. – «Народная педагогіка беларусаў» [27]. Даследаваннем народнай педагогікі беларусаў у 1990-я – 2000-я гг. займаліся Г. П. Арлова, Г. М. Курыловіч, І. І. Калачова, Л. В. Ракава. Даследчыца Г. П. Арлова падрыхтавала два выданні па дадзенай праблематыцы: «Беларуская народная педагогіка» (1993) [28] і «Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы» (1995) [29]. А ў 2008 г. Г. П. Арловай сумесна з С. Р. Туболец была выдадзена манаграфія «Традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы» [30]. Істотную ролю ў вывучэнні традыцый выхавання беларусаў адыграла І. І. Калачова. Асноўныя вынікі яе даследаванняў знайшлі адлюстраванне ў працах «Народныя традыцыі і звычаі выхавання» (1999) [31], «Сям'я і шлюб беларусаў у гістарычнай рэтраспектыве і перспектыве» (2012) [32], «Сямейныя традыцыі і этнапедагагічная спадчына беларусаў» (2018) [33]. Аўтарству Г. М. Курыловіч належыць шэраг раздзелаў аб народнай педагогіцы беларусаў у калектыўных манаграфіях [34; 35].

Сярод беларускіх даследчыкаў, хто займаўся пытаннямі сямейнага выхавання ў 1990 – пачатку 2000-х гг., вылучаецца Л. В. Ракава. Па дадзенай праблематыцы ёй падрыхтаваны шэраг прац, а ў 2010 г. даследчыца абараніла доктарскую дысертацыю па тэме «Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання ў беларусаў у XIX–XX стст.» [36]. Яна таксама апублікавала некалькі манаграфій. У 2000 г. выйшла манаграфія «Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы» [37]. Гэта кніга стала вынікам працы па дзяржаўнай тэме «Традыцыйныя формы побыту і матэрыяльнай культуры беларускага этнасу» (1996–2000 гг.). У пятым томе калектыўнага выдання «Беларусы» (2001 г.), які быў прысвечаны сям'і і сямейнай абраднасці, Л. В. Ракава падрыхтавала вялікі раздзел «Традыцыі выхавання» [35, с. 108–217]. У ім ахарактарызаваны не толькі розныя аспекты народнага выхавання дзяцей, але і разгледжаны дзіцячы побыт, гульні і забавы, месца і роля дзяцей у абрадах і г. д. А ў 2009 г. пабачыла свет яе манаграфія «Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання ў беларусаў у XIX–XX стст.» [38], якая з'яўлялася падсумаваннем даследавання феномену народнай педагогікі ў беларускай традыцыйнай культуры.

У 1990–2000-я гг. у беларускай этналагічнай навуцы разглядаецца і праблематыка сацыялізацыі дзяцей у беларускім традыцыйным грамадстве. Гэтая тэма закраналася ў даследаваннях А. Д. Якубінскай. Асабліва поўна гэтая тэма раскрываецца ў дысертацыйнай працы даследчыцы «Традыцыйныя спосабы і сродкі сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX ст.» (2009) [39]. Значны аб'ём даследаванняў аб сацыялізацыі дзяцей у беларускім традыцыйным грамадстве апублікавала Т. І. Кухаронак [40–43].

У сучаснай гуманітарыстыцы разглядаюцца і іншыя аспекты «дзіцячай» праблематыкі. Так, Т. В. Валодзіна даследавала дзіцячыя хваробы і спосабы іх лячэння ў традыцыйным беларускім грамадстве [44–47].

Ахарактарызаваныя вышэй даследаванні датычыліся агульнабеларускіх аспектаў. Пытанням рэгіянальнай спецыфікі ў іх была ўдзелена нязначная ўвага. Толькі матэрыялы з паўночнай Беларусі выкарыстоўваліся ў іх для аналізу агульнабеларускіх аспектаў. У той жа час у беларускай гуманітарыстыцы з'явіўся і шэраг рэгіянальных даследаванняў дадзенай праблематыкі. Так, вывучэннем дзіцячага фальклору паўночнай Беларусі займаецца С. У. Андрыеўская (Касцюкевіч). Даследчыца С. У. Андрыеўская займаецца вывучэннем традыцыйнай беларускай цацкі, этнаграфіі дзяцінства, а таксама механізмаў сацыялізацыі моладзі. Значнае месца ў яе даследаваннях займаюць фальклорныя і этнаграфічныя матэрыялы з паўночнай Беларусі. Па гэтай праблематыцы яна абараніла кандыдацкую дысертацыю [48] і падрыхтавала шэраг артыкулаў [49–56].

У 2007 г. супрацоўнікамі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта быў выдадзены зборнік «Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах» (складальнікі А. С. Емяльянаў і Г. П. Харошка) [57]. Зборнік утрымлівае 700 фальклорных тэкстаў (калыханак, забаўлянак, песень, заклічак, дражнілак, лічылак, жараб'ёвак). Матэрыялы, змешчаныя ў кнізе, былі зафіксаваны ў канцы XX – пачатку XXI ст. на тэрыторыі Віцебскай вобласці.

Такім чынам, на аснове аналізу апублікаваных матэрыялаў і праведзеных даследаванняў па праблематыцы прыходзім да наступных высноў. Нягледзячы на тое, што ў сусветнай навуцы вывучэнне субкультуры дзяцінства мае багатую

гісторыю і ўжо ў 1920–1940-х гг. адбываецца станаўленне такога накірунку як «этнаграфія дзяцінства», у беларускай навуцы доўгі час дадзеныя пытанні не з'яўляліся аб'ектам самастойных даследаванняў. Толькі ў канцы XX – пачатку XXI ст. з'явіўся шэраг навуковых работ, прысвечаных дадзенай праблематыцы. Але ў этнаграфічных і фальклорных зборніках быў апублікаваны вялікі аб'ём матэрыялаў па дадзенай тэме. Першыя працы, дзе быў змешчаны некаторы матэрыял па дадзенай праблематыцы, былі апублікаваны яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Да іх ліку адносяцца зборнікі А. Рыпінскага і Я. Чачота, працы П. М. Шпілеўскага і А. Г. Кіркора, якія ўтрымліваюць тэксты калыханак і дзіцячых песень, а таксама апісанні гульняў і забаў. Плённым перыядам у зборы і публікацыі матэрыялаў па тэме была другая палова XIX – пачатак XX ст. Значнае месца «дзіцячая» праблематыка знайшла ў зборніках этнографаў Ю. Ф. Крачкоўскага, М. Я. Нікіфароўскага, П. В. Шэйна, Е. Р. Раманава. У 1920–1930-я гг. асобных даследаванняў, прысвечаных «дзіцячай» тэме, было апублікавана вельмі мала. Найбольш паспяховым трэба лічыць перыяд другой паловы XX – пачатак XXI ст. У беларускай гуманітарыстыцы вывучэнне субкультуры дзяцінства ў гэты час адбывалася ў двух напрамках. Першы звязаны з вывучэннем народнай педагогікі (Г. П. Арлова, Г. М. Курыловіч, І. І. Калачова, Л. В. Ракава), а другі – дзіцячага фальклору (Г. А. Барташэвіч) і гульняў (Я. Р. Вількін, А. Ю. Лозка). У канцы XX – пачатку XXI ст. з'яўляюцца і публікацыі, прысвечаныя пытанням сацыялізацыі дзяцей у беларускім традыцыйным грамадстве (А. Д. Якубінская, Т. І. Кухаронак). У той жа час рэгіянальным аспектам дадзенай праблематыцы, а ў нашым выпадку – паўночнай Беларусі, было прысвечана даволі мала ўвагі. Толькі даследаванні С. У. Андрыеўскай у некаторай ступені запаўняюць дадзены прабел.

### *Спіс выкарыстаных крыніц*


1. *Czeczot, J.* Piosnki wieśniacze znad Dźwiny / J. Czeczot. – Wilno, 1840.
2. *Czeczot, J.* Piosnki wieśniacze znad Niemna i Dźwiny, niektóre przysłowia i idiotyzmy w mowie sławiano-krewickiej, z postrzeżeniami nad nią uczonymi / J. Czeczot. – Wilno, 1846.
3. *Rypiński, A.* Białoruś. Kilka słów o poezii prostego ludu tej naszej polskiej prowincii; o ego muzyce, śpiwie, tańcach, etc. / A. Rypiński. – Paryz, Ksiegotłoczni J. Marylskiego, 1840. – 230 s.
4. *Шпілеўскі, П. М.* Беларусь у абрадах і казках / П. М. Шпілеўскі; пер. з рус. А. Вашчанкі. – Мінск: Літаратура і Мастацтва, 2010. – 301 с.
5. *Киркор, А.* Этнографический взгляд на Виленскую губернию / А. Киркор // Этнографический сборник. – Вып. III. – 1858. – С. 115–276.
6. *Крачковский, Ю. Ф.* Быт западно-русского селянина / Ю. Ф. Крачковский. – М.: Изд. имп. Общ-ва истории древностей России при Москов. ун-те, 1874. – 212 с.
7. *Шейн, П. В.* Белорусские народные песни / П. В. Шейн. – СПб.: П. Майков, 1874. – 548 с.
8. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. – СПб.: Тип. имп. Акад. наук, 1887. – Т. I. Ч. I: Бытовая и семейная жизнь белоруса в обрядах и песнях. – 585 с.
9. *Шейн, П. В.* Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края / П. В. Шейн. – СПб.: Тип. имп. акад. наук, 1902. – Т. 3: Описание жилища, одежды, пищи, занятий; препровождение времени, игры, верования, обычное право; чародейство, колдовство, знахарство, лечение болезней, средства от напастей, поверья, суеверия, приметы и т. д. – IV, 535 с.
10. *Никифоровский, Н. Я.* Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровский. – Витебск: Губерн. Типо-Литограф., 1897. – [2], X, 307, 30 с.
11. *Никифоровский, Н. Я.* Очерки Витебской Белоруссии. VI. Игры и игроки / Н. Я. Никифоровский // Этнографическое обозрение. – 1897. – № 3. – С. 21–66.

12. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Киев: Тип. С. В. Кульженко,1885. – Вып. 1–2: Песни, пословицы, загадки. – 468 с.

13. *Романов, Е. Р.* Белорусский сборник / Е. Р. Романов. – Вильно: Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8: Быт белоруса. – VIII, 600 с.

14. *Богданович, А. Е.* Пережитки древнего миросозерцания у белорусов. Этнографический очерк / А. Е. Богданович. – Гродно: Губернская типография, 1895. – III, 186 с.

15. *Касьпяровіч, М.* Для чаго і як вывучаць быт дзяцей / М. Касьпяровіч // Наш край. – 1930. – № 4. – С. 15–20.

16. Гульні, забавы, ігрышчы / склад. А. Ю. Лозка. – Мінск: Беларуская навука, 2000. – 532 с.

17. *Kazłoŭščyk, U.* Ab fizyčnym wychawańni ŭ biełarusaŭ / U. Kazłoŭščyk // Biełaruskaja krynica. – 1928. – № 33–53.

18. *Шлюбскі, А.* Матэрыялы да вывучэння фальклору і мовы Віцебшчыны: у 2 ч. / А. Шлюбскі. – Мінск: Інбелкульт, 1928. – Ч. 2. – 259 с.

19. *Сахараў, С. П.* Народная творчасць латгальскіх і ілукстэнскіх беларусаў / С. П. Сахараў. – Рыга: Latijas baltkrievu biedribas izdevums, 1940. – 160 с.

20. *Каспяровіч, В.* Сто гульняў / В. Каспяровіч. – Мінск: Дзярж. выд-ва БССР, 1948. – 170 с.

21. *Вількін, Я. Р.* Беларускія народныя гульні: зборнік дзіцячых гульняў / Я. Р. Вількін. – Мінск: Народная асвета, 1969. – 75, [1] с.

22. *Вилькин, Я. Р.* Белорусские народные игры второй половины XIX — начала XX в.: автореф. дис. ... канд. ист. наук / Я. Р. Вилькин. – Минск, 1971. – 17, [1] с.

23. *Барташэвіч, Г. А.* Дзіцячы фальклор / Г. А. Барташэвіч, В. І. Ялтаў. – Мінск: Навука і тэхніка, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору, 1972. – 736 с.

24. *Барташэвіч, Г. А.* Вершаваныя жанры беларускага дзіцячага фальклору / Г. А. Барташэвіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 164, [2] с.

25. Малыя жанры. Дзіцячы фальклор / Т. В. Валодзіна [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 438, [1] с.

26. Нарысы педагагічнай думкі беларускага народа / Я. І. Сырмяжка [і інш.]. – Магілёў: Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, 1995. – 131 с.

27. Народная педагогіка беларусаў / Нацыянальны інстытут адукацыі. – Мінск: НІА, 1996. – 165 с.

28. *Арлова, Г. П.* Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мінск: Народная асвета, 1993. – 119, [1] с.

29. *Арлова, Г. П.* Народная педагогіка ў выхаваўчай рабоце школы / Г. П. Арлова. – Мінск: ГВЗАТ «Маладняк», 1995. – 157, [2] с.

30. *Арлова, Г. П.* Традыцыі эстэтычнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы: манаграфія / Г. П. Арлова, С. Р. Туболец. – Віцебск: ВДУ, 2008. – 162 с.

31. *Калачова, І. І.* Народныя традыцыі і звычаі выхавання: Этнапед. спадчына народаў Беларусі / І. І. Калачова; Нац. ін-т адукацыі. – Мінск: НІА, 1999. – 179 с.

32. *Калачова, І. І.* Сям'я і шлюб беларусаў у гістарычнай рэтраспектыве і перспектыве / І. І. Калачова. – Мінск: РІВШ, 2012. – 123 с., [2] л. іл.

33. *Калачова, І. І.* Сямейныя традыцыі і этнапедагагічная спадчына беларусаў / І. І. Калачова. – Мінск: РІВШ, 2018. – 121 с, [2] л. іл.

34. Сям'я і сямейны быт беларусаў / Акадэмія навук Беларускай ССР, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск: Навука і тэхніка, 1990. – 253, [3] с.

35. Беларусы / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы. – Т. 5: Сям'я / В. К. Бандарчык [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2001. – 374, [1] с.

36. *Ракава, Л. В.* Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст.: аўтарэферат дыс. ... д-ра гіст. Навук / Л. В. Ракава. – Мінск, 2010. – 43 с.

37. *Ракава, Л. В.* Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава. – Мінск: Ураджай, 2000. – 111 с.

38. *Ракава, Л. В.* Эвалюцыя традыцый сямейнага выхавання беларусаў у XIX–XX стст. / Л. В. Ракава. – Мінск: Беларуская навука, 2009. – 309, [2] с.

39. *Якубінская, А. Д.* Традыцыйныя спосабы і сродкі сацыялізацыі дзяцей у беларускіх сялян у другой палове XIX – першай палове XX ст.: аўтарэф. ... дыс. канд. гіст. навук / А. Д. Якубінская; Бел. дзярж. ун-т. – Мінск, 2009. – 22 с.

40. *Кухаронак, Т. І.* «Каб вялікае расло...». Рытуальнае фармаванне мужчынскага і жаночага статусаў на першым этапе сацыялізаці ў традыцыйнай культуры беларусаў / Т. І. Кухаронак // Роднае слова. – 2004. – № 8. – С. 107–110.

41. *Кухаронак, Т. І.* «Люлі, люлі, малое, каб на лета другое...». Абрадавыя дзеянні на працягу першага года жыцця дзіцяці ў традыцыйнай культуры беларусаў / Т. І. Кухаронак // Роднае слова. – 2000. – № 11. – С. 105–106.

42. *Кухаронак, Т. І.* Першы этап сацыялізацыі дзяцей у традыцыі беларусаў / Т. І. Кухаронак // Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання і пераемнасці: зб. матэрыялаў нав.-практ. канф. – Мазыр: МазДПІ імя Н. К. Крупскай, 2001. – С. 99–104.

43. *Кухаронак, Т. І.* Фальклор як сродак сацыялізацыі дзяцей / Т. І. Кухаронак // Веснік БелІПК: нав.-метад. зб. – Вып. 2. – Мінск, 1995. – С. 16–28.

44. *Валодзіна, Т. В.* Народная наменклатура дзіцячых хвароб: этналінгвістычны аспект / Т. В. Валодзіна // Беларуская мова ў культурнай і моўнай прасторы Славіі: матэрыялы Міжнар. навук. канф., Мінск, 24–25 лістап. 2009 г. / Інстытут мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. – Мінск: Права і эканоміка, 2009. – С. 55–60.

45. *Валодзіна, Т. В.* Капрызы ў сістэме дзіцячых хвароб (па матэрыялах з Лепельшчыны) / Т. В. Валодзіна // Лепельскія чытанні: матэрыялы II навук.-практ. канф., Лепель, 18–19 кастр. 2006 г. – Лепель, 2006. – С. 29–31.

46. *Валодзіна, Т. В.* Міфарытуальны аспект народнай медыцыны беларусаў: начніцы / Т. В. Валодзіна // Весці Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2005. – № 1. – С. 73–78.

47. *Валодзіна, Т. В.* Этнасеміётыка дзяцінства: дзіцячыя хваробы і этапы сацыялізацыі дзіцяці ў славянскім фальклоры / Т. В. Валодзіна // Мовазнаўства. Літаратуразнаўства. Фалькларыстыка: XIV Міжнародны з’езд славістаў, Охрыд, 10–11 вер. 2008 г.: дакл. бел. дэлегацыі / НАН Беларусі; Беларускі камітэт славістаў. – Мінск: Права і эканоміка, 2008. – С. 291–306.

48. *Касцюкевіч, С. У.* Семантыка і функцыі традыцыйных цацак беларусаў у XIX–XX стст.: аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. навук / С. У. Касцюкевіч. – Мінск, 2004. – 20 с.

49. *Андрыеўская, С. У.* Дзіцячы фальклор як элемент культуры беларусаў (па этнаграфічных матэрыялах Віцебшчыны) / С. У. Андрыеўская // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў: зб. навук. артыкулаў II міжнар. навук. канф., Полацк, 17–18 красав. 2014 г.: у 2 ч. / Полацкі дзярж. ун-т; пад агульн. рэд. Д. У. Лобача, С. А. Шыдлоўскага. – Наваполацк: ПДУ, 2014. – Ч. 1. – С. 134–141.

50. *Андрыеўская, С. У.* Магічныя прыёмы і забабоны ў беларускай культурнай традыцыі выхавання дзяцей / С. У. Андрыеўская // Европа: актуальные проблемы этнокультуры: материалы Междунар. науч.-теорет. конф., г. Минск / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол. В. В. Тугай (отв. ред.) [и др.]. – Минск: Минский государственный ПТК полиграфии, 2015. – С. 264–266.

51. *Андрыеўская, С. У.* Роля дзяцей у абрадах і святах каляндарнага цыкла на Падзвінні / С. У. Андрыеўская // Европа: актуальные проблемы этнокультуры: материалы VII междунар. науч.-теорет. конф., 21 янв. 2013 г. Минск / Бел. гос. пед ун-т им. М. Танка; редкол.: В. В. Тугай (отв. ред.)[и др.]. – Минск: МГПТК полиграфии, 2014. – С. 94–96.

52. *Андрыеўская, С. У.* Традыцыйнае сямейнае выхаванне і побыт дзяцей на тэрыторыі беларускага Падзвіння: гістарыяграфія і крыніцы / С. У. Андрыеўская // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А: Гуманитарные науки: научно-теоретический журнал. – 2009. – № 7. – С. 71–74.

53. *Андрыеўская, С. У.* Традыцыйныя прыёмы гадавання дзяцей на Падзвінні / С. У. Андрыеўская // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых даследаванняў (да 80-годдзя пачатку археалагічных раскопак у г. Полацку): зб. нав. прац рэсп. нав.-практ. семінара 20–21 ліст. 2008 г. / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Полацкі дзяржаўны універсітэт; пад агул. рэд. Д. У. Дука, У. А. Лобача. – Наваполацк: ПДУ, 2009. – С. 123–128.

54. *Андрыеўская, С. У.* Традыцыі выхавання і побыту дзяцей на тэрыторыі беларускага Падзвіння ў кан. XIX – пач. XXI ст. / С. У. Андрыеўская // Етнічна культура в глобалізованому світі. Збірка наукових праць Другой Міжнар. наук. конф. студентів, аспірантів та молодих вчених, присвяченой 200-річчю Т. Г. Шевченка. – Одеса, 2014. – С. 16–26.

55. *Андрыеўская, С. У.* Палявыя даследаванні Падзвіння па этнаграфіі дзяцінства летам 2010 г. / Андрыеўская С. У. // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А: Гуманитарные науки. – № 1. – 2011. – С. 92–98.

56. *Андрыеўская, С. У.* Праблемы збірання і аўтэнтычнасці дзіцячага фальклора / С. У. Андрыеўская // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. навук. арт. Вып. XIII. – Минск: РІВШ, 2017. – С. 40–44.
57. *Емельянаў, А. С.* Дзіцячы фальклор Віцебшчыны ў сучасных запісах / А. С. Емяльянаў, Г. П. Харошка. – Віцебск: ВДУ імя П. М. Машэрава, 2007. – 200 с.

**Modern Youth and Society, Volume 9, 2021**

# HISTORY OF THE STUDY OF CHILDHOOD SUBCULTURE OF NORTHERN BELARUS

**Uladzimir AUSEICHYK**

**Abstract:** The article deals with the historiography of the issues of childhood subculture of Northern Belarus in domestic humanitarian science. The main periods in the study of the problems are distinguished, the significance of the studies and their contribution to the study of childhood subculture are disclosed. The works published since the middle of the nineteenth century up to the present time are analyzed in the article.

**Keywords:** historiography, childhood subculture, Northern Belarus, Belarusian ethnicity.

**Дата падачы: 01.03.2021 г.**